24,8%, у абслуговых галінах — 52% (2000).

Гісторыя. Стараж. насельніцтва Я. — плямёны індзейцаў-аравакаў. В-аў Ямайка адкрыты Х.*Калумбам* у 1494. У выніку ісп. каланізацыі (з 1509) амаль усе індзейцы знішчаны (да 1611 заставалася 74 чал.). Для работы на плантацыях з 1513 пачуўся ўвоз неграў-нявольнікаў з Афрыкі. У 1655 Я. захапіла Англія (у 1670 замацавана за ёй афіцыйна). Да 1692, калі землетрасенне разбурыла на Я. пірацкую сталіцу Порт-Роял, востраў быў цэнтрам піратства ў Карыбскім бас. З канца 17 ст. павялічылася вытв-сць цукровага трысняку (Я. стала адным з асн. яго вытворцаў), што стымулявала ўзмоцнены ўвоз нявольнікаў (да 1830-х г. на Я. прададзена каля 1 млн. нявольнікаў з Афрыкі). У 1833 рабства скасавана, б/ч. былых нявольнікаў занялася дробнай сял. гаспадаркай. Абураныя ўціскам з боку калан. улад яны ў 1865 узняліпаўстанне, задушанае брыт. войскамі. У 1866 на Я. створаны Заканад. савет, з 1884 ч. яго членаў выбіралася насельніцтвам. У 1938 створана Нар. нац. партыя (ННП), у 1943 — Лейбарыстская партыя Я. (ЛПЯ). У 1943 уведзена ўсеагульнае выбарчае права, у 1944 створаны І-ы ўрад Я. У 1958—61 Я. — чл. Вест-Індскай Федэрацыі, у 1959 атрымала ўнутр. самакіраванне. 6.8.1962 абвешчана незалежнасць Я. Паліт. жыццё краіны характарызуецца саперніцтвам ННП і ЛПЯ (у 1962—72 і 1980—89 улада належала ЛПЯ, у 1972—80 і з 1989 — ННП). У 1970-я г. ўрад ННП на чале з М.Мэнлі здзейсніў шэраг сац. рэформ. У 1992 урад Я. ўзначаліў П.Патэрсан. Я. — чл. ААН (з 1962), Арг-цыі амер. дзяржаў (з 1969), Лац.-амер. эканам. сістэмы (з 1975), інш. міжнар. арг-цый. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 6.6.1994.

Гаспадарка. Я. — аграрна-індустр. краіна з гаспадаркай, для якой характэрна многагаўкладнасць, вузкая спецыялізацыя і залежнасць ад замежнага капіталу. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) у 2000 склаў 9,7 млрд. дол. (3,7 тыс. дол. на душу насельніцтва). Аснова эканомікі — баксітна-гліназемная прам-сць, турызм і сельская гаспадарка, якія даюць 95% валютных паступленняў. Штогадовая здабыча баксітаў каля 12 млн. т (3-е месца ў свеце пасля Аўстраліі і Гвінеі), вытв-сць гліназёму каля 3,5 млн. т (3-е месца ў свеце пасля Аўстраліі і ЗША). Асн. цэнтры: Маготы, Порт-Кайзер, Юартан. Пануе замежны амерыканскі і канадскі капітал. Здабыча гіпсу (каля пас. Баф-Бей) перавяжна на экспарт у ЗША, часткова на вытв-сць цэменту на з-дзе каля Кінгстана. Вытв-сць электраэнергіі 6,74 млрд. кВт·гадз (1999) у асноўным на ЦЭС, што працуюць на прыязным мазуце, і невял. ГЭС на рэках Рыо-Кобрэ, Блэк-Рывер і Рэарынг. Адна са старэйшых галін апрацоўчай прам-сці — цукровая, найб. прадпрыемствы якой належаць англ. капіталу. З цукр. трыснягу вырабляюць таксама патаку-мелес і ром. Большая ч. прадукцыі экспартуецца ў Вялікабрытанію, ЗША, Канаду. Прадпрыемствы харч., тытунёвай, дрэваапр., хім., фармацэўтычнай прам-сці, вытв-сць бавоўняных тканін, нафтаперапрацоўка імпартуемай нафты, зборка аўтамабіляў, у т.л. электронікі. Асн. ч. прадпрыемстваў размешчана ў Кінгстане і яго прыгарадах. У сельскай гаспадарцы пераважае раслінаводства. Worныя земл. займаюць 19% тэр., пад лугамі і пашай 18%. Разам з буйнымі плантацыйнымі гаспадаркамі існуюць і дробныя сялянскія ўладанні (65% усіх гаспадарак). Асн. экспартная культура — цукр. трысняг — вырошчваюць на буйных плантацыях з цукр. з-дамі (сентралямі). На экспарт вырошчваюць таксама бананы, цытрусавыя, каву, какава, ямайскі перац, імбір, ананасы, тытунь; для мясц. спажывання — ямс, батат, маніёк, кукурузу, рыс, памідоры, боб. Жывёлагадоўля развіта слаба. Пагалоўе (тыс. галоў, 2001): буйн. раг. жывёлы — 400, свіней — 180, коз — 440, авечак — 1,4, птушак — 1100. Рыбалоўства (11,5 тыс. т, 1999). Вял. роля ў эканоміцы краіны належыць замежнаму турызму. У 2000 Я. наведалі 1,2 млн. турыстаў, штогадовы даход склаў 1,5 млрд. Даўж. чыгунак 330 км, аўтадарог 18,2 тыс. км. Аўтапарк (1999) 225 тыс. машын. Гал. марскія парты: Кінгстан і Мантэга-Бей. 2 міжнар. аэрапорты. Экспарт (1,7 млрд. дол., 2000) баксітаў і гліназёму (40% кошту экспарту), с.-г. прадукцыі. Імпарт (3 млрд дол., 2000) паліва і сыравіны (50%), прамысл. абсталявання, трансп. сродкаў, харч. і спажывецкіх тавараў. Асн. гандл. партнёры: ЗША (32% экспарту і 48% імпарту), Канада, Вялікабрытанія, Трынідад і Табага, Японія. Грашовая адзінка — ямайскі долар.

Н.А.Сцепанова (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *В.У.Адзярыха* (гісторыя).



Да арт. **Ямайка**. Курорт Оча-Рыяс.

ЯМАКАПА́ЛЬНІК, навясная (на трактар) с.-г. машына для капання ям цыліндрычнай формы пад пасадку саджанцаў пладовых, лясных і інш. культур, а таксама для буд. работ на грунтах сярэдняй шчыльнасці (напр., устаноўкі слупоў).

Рабочыя органы Я. — зменныя буры (двухзаходныя вінты з завостранымі краямі), прывод іх ад вала адбору магутнасці трактара. Дыяметр ям 0,3—1 м, глыбіня да 0,7 м. Я. ЯК-0,7 НВА «Белсельгасмеханізацыя» мае зменныя буры дыяметрам 0,2 і 0,35 м для капання ям глыбінёй да 0,7 м; прадукцыйнасць 100 ям за гадзіну.

Літ.: Клочков А.В. Механизация работ в плодоовощеводстве. Мн., 2002.

В.М.Кандрацьеў.

ЯМА́Л, паўвостраў на Пн Зах. Сібіры, паміж Байдарацкай і Обскай губамі Карскага м., у Ямала-Ненецкай аўт. акрузе Расіі. Даўж. 700 км, шыр. да 240 км, пл. 122 тыс. км². Складзены пераважна з пясчана-гліністых марскіх, на Пд — ледавіковых адкладаў. Паўсюдна пашырана шматгадовая мерзлата. Мноства азёр (Ярато, Ямбуто, Нейто і інш.), шматлікія формы крыягеннага рэльефу. На Пн — арктычная тундра, у цэнтр. раёнах — забалочаная мохава-лішайнікавая і хмызняковая расліннасць; на Пд — лістоўнічная лесатундра. Радовішчы газу. Аленегадоўля, паляванне, рыбалоўства. На беразе Обскай губы — пас. Новы Порт.

ЯМА́ЛА-НЕ́НЕЦКАЯ АЎТАНО́МНАЯ АКРУ́ГА. У Цюменскай вобл. Рас. Федэрацыі. Размешчана на Пн Зах. Сібіры, часткова за Паўн. палярным кругам; уключае і групу астравоў у Карскім м. (Белы, Алені, Шакальскага і інш.). Утворана 10.12.1930. Пл. 750,3 тыс. км². Нас. 507,4 тыс. чал. (2002), гарадскога 83%. Цэнтр — г. *Салехард*. Найб. гарады: Наябрск, Новы Урэнгой, Надым (гл. карту да арт. *Цюменская вобласць*).

Асн.ч. тэр. — забалочаная нізінная раўніна. На Пн, да берагоў Карскага м. і яго заліваў, прылягаюць прыморскія раўніны, на Пд пашыраны мерзлінныя і водна-ледавіковыя раўніны. На З адгор'і Палярнага Урала (выш. да 1499 м, г. Паер), на Пд З Сібірскія Увалы і Паўн.-Сосьвінскае узвышша. Карысныя выкапні: прыродны газ (каля 6 трлн. м³; 37% сусв. і 90% запасаў Расіі), нафта і газавы кандэнсат (каля 1 млрд. т; 12% запасаў Расіі), золата, свінец, фасфаты, храмітыі, вапняк і інш. Клімат рэзка кантынентальны. Зіма суровая, доўжыцца каля 8 месяцаў, з частымі мяцелицамі і моцнымі бурамі. Сярэдняя з-ра студз. ад -22 да -26 °С. Лета кароткае (каля 50 дзён), халаднаватае, з густымі туманамі. Сярэдняя т-ра ліп. ад 4 да 14 °С. Ападкаў 200—400 мм за год. На тэр. акругі каля 48 тыс. рэк, у т.л. 200 з даўж. больш за 100 км. Гал. рэкі — Об, Таз, Надым, Пур, Месаяха. Каля 300 тыс. азёр, пераважна ледавіковага паходжання. Глебы тундравыя, глеевыя, балотныя, на Пд глеева-падзолістыя і падзоліста-балотныя. З Пн да Пд арктычная мохава-лішайнікавая і хмызнічковая тундры пастубова зменьваюцца лесатундрай. На Пд, па берагах рэк і азёр, лясы з сіб. лістоўніцы, елкі і кедра. У тундры трапляюцца паўн. алень, заяц-бяляк, пясец і воўк; у паўд. ч. — собаль, каланок, вавёрка, бурундук, з птушак — белая і тундравая курапаткі, глушэц, рабчык і інш. У рэках і азёрах шмат рыбы (асётр, нельма, муксун, сіг), у Обскай і Тазаўскай губах водзяцца белуха, нерпа. Верхнятазаўскі запаведнік.

Гал. галіна прам-сці — нафтагазавая (90% агульнага аб'ёму прадукцыі) уключае здабычу, першасную апрацоўку і транспарціроўку газу і нафты. Штогод здабываюць 530 млрд. м³ газу і 30 млн. т нафты і газавага кандэнсату. Асн. радовішчы газу — Урэнгойскае, Мядзведжае, Ямбургскае, Вэнгапураўскае і інш.; нафты — Халмагорскае і інш. Газаперапрацоўка на з-дах у Мураўленка, Наябрску, Вэнгапуры. Асн. прадпрыемствы галіны ў складзе канцэрна «Газпрам». Вытв-сць электраэнергіі на Урэнгойскай ДРЭС. Развіты лясная і дрэваапр. прам-сць, вытв-сць буд. матэрыялаў. Прадпрыемствы харч. прам-сці ў Салехардзе (рыбакансервавы, малочны і інш. з-ды), Наябрску і інш. Аленегадоўля. Звярагадоўля (серабрыста-чорны ліс, блакітны пясец, норка). Пушны промысел. Бульбаводства (каля г. Салехард, у Краснасельскупскім, Шурышкарскім, Пураўскім р-нах). Даўж. чыгункі 495 км (Сургут—Новы Урэнгой, Сейда—Лабытнагі). Развіты трубаправодны транспарт. Сістэма газаправодаў звязвае акругу з сўрап. ч. Расіі, Уралам, Пд Сібіры, з замежнымі краінамі. Суднаходства па рэках Об, Надым, Пур, Таз і Паўн. марскім шляху. З аэрапорты. Мясц. перавозкі на аленях.

М.Л.Страха.

ЯМАМО́ТА Ісароку (4.4.1884, Нагаока, прэфектура Ніігата, Японія — 18.4.1943), японскі ваен. дзеяч. Адмірал (1940). Скончыў Марскую акадэмію (1904) і Ваен.-марскі штабны каледж (1916), вучыўся ў Гарвардскім ун-це (ЗША, 1919—21). Удзельнік рус.-яп. вайны 1904—05 (Цусімскі бой 1905), 1-й і 2-й сусв. войнаў. З 1921 выкладаў у Марской акадэміі. З 1925 ваен.-марскі аташэ Японіі ў ЗША. З 1935 нам. марскога міністра, з 1938 камандз. 1-м яп. флотам. У 2-ю сусв. вайну (з ліст. 1940) галоўнакаманд. Аб'яднаным флотам Японіі. Пад яго кіраўніцтвам яп. ВМС напалі на *Пёрл-Харбар*, дзейнічалі каля атола Мідуэй (чэрв. 1942) і інш. (гл. *Ціхаакіянскія кампаніі 1941—45*). Загінуў у раёне Саламонавых а-воў (самалёт Я. быў збіты амер. авіяцыяй, якая атрымала інфармацыю пра яго вылет на в-аў Бугенвіль).

Літ.: Агава Хироки. Адмирал Ямамото: Путь самурая, разгромившего Перл-Харбор, 1921—1943 гг.: Пер. с яп. М., 2003.

У.Я.Калаткоў.

ЯМАМО́ТА Сацуа (15.7.1910, г. Кагосіма, Японія — 11.8.1983), японскі кінарэжысёр, адзін з пачынальнікаў руху «незалежных» у яп. кіно. Вучыўся ва ун-це Васэда. З 1933 працаваў у розных кінакампаніях. Дэбютаваў фільмам «Варша дачка» (1937). У яго фільмах «Вайна і мір» (1947, з Ф.Камэі), «Бура ў гарах Хаконэ», «Зона пустаты» (абодва 1952), «Вуліца без сонца» (1954, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах), «Песня каляскі» (1959), «Барацьба без зброі» (1960) і інш. вострыя паліт. і сац. праблемы. Сярод інш. значных работ: «Вялікая белая вежа» (1966, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Маскве 1967), гіст. эпапея «Вайна і людзі» (6 серый; 1970—73; спец. прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах 1974), «Цудоўная сям'я» (1974), «Кольцападобнае зацьменне сонца» (1975), «Гісторыя Суйко эпохі Тэмпо» (1976), «Пераварал Намуті» (1979). Для яго творчасці характэрны ідэйная глыбіня, вострая палемічнасць, бязлітаснае сац. выкрыццё.

Літ.: Ивасаки А. История японского кино: Пер. с яп. М., 1966.

ЯМАНТ Іосіф (Юзаф) Мацвеевіч (1841, Вільня — ?), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863—64* на Беларусі і ў Літве. Брат М.*Ямант*. Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це (1858—61), дзе далучыўся да вызв. руху. Прыхільнік партыі «чырвоных». З лета 1863 сакратар К.Каліноўскага, яго паплечнік па кіраўніцтве паўстаннем. Кватэра Я. ў Вільні — адна з гал. канспіратыўных кватэр Каліноўскага таго перыяду. На даручэнні Каліноўскага вёў паленіку з Варшавай, склаў найважнейшыя інструкцыі для мясц. паўстанцкіх структур. З вер. 1863 у Мінску наладжвай работу паўстанцкай арг-цыі, з кастр. 1863 паўстанцкі камісар Мінскай губ. У студз. 1864 арыштаваны і высланы ў Сібір (г. Томск), дзе ўдзельнічаў у дзейнасці рэв. арг-цыі.

Літ.: Смирнов А.Ф. Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. М., 1963; Каліноўскі К. За нашую вольнасць: Тв., дак. Мн., 1999.

Г.В.Кісялёў.

ЯМАНТ Марыя Мацвееўна (1843, Вільня — ?), удзельніца вызваленчага руху паплечніца К.*Каліноўскага*, адрасатка

яго развітальнага верша, дасланага з-за турэмных кратаў («Марыська чарнаброва, галубка мая...»). Прымала актыўны ўдзел у перадпаўстанцкіх дэманстрацыях у Вільні і дзейнасці віленскай рэв. арг-цыі (т.зв. Жаночы к-т). У 1864 разам з бацькамі і сястрой выслана ў Табольск (Зах. Сібір), дзе кантактавала з падп. арг-цыямі, удзельнічала ў спробах рэвалюцыянераў вызваліць з сібірскай ссылкі М.Г.Чарнышэўскага. Пасля вяртання з Сібіры (1874) жыла ў Варшаве. Яе вобраз адлюстраваны ў шэрагу твораў бел. л-ры і выяўл. мастацтва.

Літ.: Шалькевіч В. «Марыська чарнаброва, галубка мая...»: Невядомыя старонкі з жыцця Кастуся Каліноўскага // Роднае слова. 1994. №3—4.

Г.В.Кісялёў.

ЯМАНТА́Ў, найбольш высокі горны масіў Паўд. Урала, у Башкірыі (Расія). Выш. да 1640 м. Складзены з крышт. парод і кварцытаў. Глыбока расчлянёны схілы ўкрыты мяшанымі лясамі, вышэй 1250 м — травяна-мохавая тундра і камяністыя россыпы.

ЯМАСА́КІ (Yamasaki) Мінору (1.12.1912, г. Сіэтл, ЗША — 1986), амерыканскі архітэктар. Скончыў ун-т штата Вашынгтон у Сіэтле (1934). Зазнаў уплыў *Міса ван дэр Роэ*, а таксама сярэдневяковага яп. і інд. дойлідства. У творах характэрныя тэндэнцыі сучаснага амер. неакласіцызму: будынкі канторы «Рэйналдс металс» у г. Дэтройт (1959), Цэнтра міжнар. гандлю ў Нью-Йорку (1971—73, у саўт.). Я. эфектыўна выкарыстоўваў экзатычныя матывы яп. мастацтва ў кантрасце з плоскасцямі бетону, шкла ці металу, блочныя канструкцыі, складкавыя дахі.

ЯМА́ТА, племянны саюз у стараж. Японіі з цэнтрам каля сучаснага г. Нара. Узнік у 2-й пал. 3 ст., да сярэдзіны 4 ст. аб'яднаў пад сваёй уладай б.ч. краіны. На базе Я. паступова склалася яп. дзяр-

Да арт. **Ямата-э**. Фрагмент скрутка, які ілюструе апосвесць «Гэндзі Манагатары». Каля 12 ст.

ЗРАЗОК